# «Радзіма — адзіная, іншай не дадзена. Яе не толькі трэба любіць, яе трэба абараняць»

## Такі наказ сучаснаму пакаленню ад ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны

**Эпіцэнтрам святкавання 9 Мая ў беларускай сталіцы ўжо каторы год з'яўляецца плошча Перамогі. Людзі ўсіх узростаў, з сем'ямі, імкнуліся да велічнага манумента, каб аддаць даніну павагі тым, хто ў маі 1945 года здабыў найгалоўнейшую каштоўнасць для ўсяго чалавецтва — МІР. У чаканні кіраўніка дзяржавы, які, нягледзячы на шчыльны графік, заўсёды ў гэты дзень прымае ўдзел у адной з важных урачыстасцяў краіны, карэспандэнты «Звязды» пагутарылі з гасцямі мерапрыемства з нагоды 79-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.**






Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Як падкрэсліў **міністр абароны Віктар ХРЭНІН,** у Беларусі — міралюбівая палітыка і наша краіна нікому не пагражае. Аб гэтым не раз гаварыў наш Прэзідэнт, аб гэтым паведамлялася на Усебеларускім народным сходзе. «Не імкнёмся захопліваць нейкія землі, — дадаў кіраўнік абароннага ведамства. — Мы жадаем жыць у сябе спакойна, гадаваць сваіх дзяцей. Тое, што сёння адбываецца, можна так назваць: нашчадкі пераможаных кінулі выклік нашчадкам пераможцаў. Жадаюць узяць рэванш. У іх нічога не атрымаецца. Няхай вучаць гісторыю. Мы будзем, як патрабуе гэтага Галоўнакамандуючы, дакладна, упэўнена захоўваць і захоўваць сваё. А калі трэба, дадзім сур'ёзны адпор усім, хто замахнецца на нашу зямлю. Таму не хвалюйцеся. Як сказаў Прэзідэнт, усе павінны рабіць сваю справу».

**Герой Беларусі Марына ВАСІЛЕЎСКАЯ** прызналася, што 9 Мая для яе праходзіць са слязамі на вачах. «Мы ведаем, якой цаной нам дасталася Перамога, таму нізкі паклон ветэранам, савецкім салдатам, нашым дзядам, прадзедам, — падкрэсліла касманаўт. — Мы ўсе будзем памятаць гэтую пакутніцкую Перамогу. З іншага боку, гэта свята радасці. Наш свет — за шчаслівую будучыню, усмешкі і радасць нашых бацькоў і дзяцей. Са свайго боку мы павінны цаніць і берагчы мір, бо жыццё чалавека вельмі крохкае і мір можна разбурыць за адну секунду».

Ад сваіх бабулі і дзядулі Марына Васілеўская чула шмат жахаў пра вайну. Нягледзячы на тое, што акупацыю яны засталі ў дзіцячым узросце, гэтага хапіла, каб назаўжды ўсвядоміць, што вайна — самае жудаснае, што можа быць у жыцці. «Дзядуля ўспамінаў, як на яго вачах расстралялі сястру яго маці разам з дачкой, — расказала яна. — Дзядуля, калі гэта ўспамінаў, вельмі хваляваўся і плакаў. Мы будзем памятаць аб подзвігах нашых продкаў і цаніць усё, што маем».

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Алег ГАЙДУКЕВІЧ** звярнуў увагу на тое, што ў сучасных умовах берагчы памяць аб тых падзеях няпроста. «Нашы ворагі робяць усё, каб сцерці памяць, — патлумачыў дэпутат. — Кожны дзень вядуцца спробы забраць у нас гісторыю: пачынаючы ад работы з моладзю, заканчваючы мільёнамі долараў у прапаганду чужой, ілжывай гісторыі. Нас хацелі прымусіць забыцца, не памятаць ці, напрыклад, мы часта чулі заклікі святкаваць 9 Мая ціха і незаўважна, дзе-небудзь за вуглом. Як толькі б мы на гэта пайшлі, можна казаць аб тым, што будучыні ў краіны няма. Прыклад — суседнія краіны. Усе, хто адмовіліся ад савецкай мінуўшчыны, усе, хто адмовіўся ад сваёй гісторыі, адкаціліся назад мінімум на сто гадоў таму».

Алег Гайдукевіч расказаў, што яго дзядуля — ветэран вайны, партызан, які пасля вайны змагаўся з бандэраўцамі і былымі паліцаямі. «Маёй сям'і не раскажаш казкі пра добрых паліцаяў, — зухаважыў ён. — Мой дзед рыхтаваўся да 9 Мая заўсёды загадзя. За тыдзень ён чакаў, калі яго запросяць выступіць у школе. Ён вельмі хацеў гэтага, я памятаю. Ён даставаў парадны ветэранскі кіцель, медалі. Ён радаваўся тут, на святой плошчы Перамогі, гэтаму вялікаму святу. Я бачыў гэта дзіцем. І як я цяпер магу святкаваць ціха, калі мой дзед святкаваў і ганарыўся гэтым?

**Заснавальнік дабрачыннага фонду імя А. Талая, грамадскі дзеяч Аляксей ТАЛАЙ** падкрэсліў, што вялікае свята адзначаецца ўсёй краінай, Саюзнай дзяржавай. «Мы бачылі і радаваліся, як кіраўнік дзяржавы са сваімі сябрамі і паплечнікамі быў на Краснай плошчы ў Маскве і назіраў за святочным парадам, а цяпер мы тут, у Мінску, беларусы, чакаем свайго Прэзідэнта, каб сказаць важныя словы аб тым, што ніхто не забыты, нішто не забыта, — адзначыў ён. — Пакаленне сучасных беларусаў мае сілу і рашучасць адстойваць далей інтарэсы Беларусі. Нам хопіць сілы справіцца ў гэты няпросты час. І, вядома ж, мы ўсе разумеем, што часы вельмі няпростыя, важныя. І на УНС Прэзідэнт пра гэта казаў, што куды ўжо бліжэй да эскалацыі, калі гаворка ідзе аб ужыванні ядзернай зброі. І мы пра гэта гаворым адкрыта, што ніякіх тут не будзе магчымасцяў прыйсці і за лічаныя тыдні прайсці Беларусь. Мы маем планы па адбіцці любой агрэсіі. І з нашай арміяй, нашымі саюзнікамі мы з усім справімся».

Для **першага намесніка старшыні Мінгарвыканкама Надзеі ЛАЗАРЭВІЧ** Дзень Перамогі з'яўляецца асаблівым. Яна мела шчасце з першых вуснаў чуць аб гэтых падзеях ад свайго прадзеда Кірыла Сямёнавіча Бурдзя. «Ён дайшоў да Берліна, быў на Эльбе, быў кантужаны, вярнуўся, дзякуй богу, дахаты, выхоўваў чацвярых дзяцей, — расказала яна. — У нашай сям'і вельмі ганарацца ім. Памятаю яго старэнькага, і, калі ён расказваў пра тыя жудасныя хвіліны, заўсёды плакаў. Мае бабуля і дзядуля дзецьмі засталі вайну, жылі ў партызанскай вёсцы. Расказвалі, што самае дарагое аддавалі нашым партызанам, нашым воінам і заўсёды казалі: самае галоўнае — каб не было вайны».

Ветэраны — галоўныя героі свята — хоць і не ў вялікай колькасці, але прысутнічалі падчас урачыстасці. Нешматслоўныя, але вельмі шчаслівыя, што дачакаліся чарговай гадавіны Перамогі, удзячныя за тое, што пра іх не забываюць.

**Ветэрану Леаніду ЯРОМІНУ** было 13 гадоў, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна. Ён, як і многія яго равеснікі, не мог знаходзіцца ўбаку і пайшоў у партызанскі атрад імя Кутузава 100-й брыгады імя Кірава, якая дзейнічала ў Старадарожскім і Любанскім раёнах. «Дня Перамогі мы чакалі чатыры гады і дачакаліся, — згадвае ён. — У гэты святы дзень я хачу сказаць моладзі, каб яна любіла сваю Радзіму, сінявокую Беларусь. Гэтая Радзіма — адзіная, іншай не дадзена. Яе не толькі трэба любіць — яе трэба абараняць».

«Усе цяпер кажуць аб міры, — канстатаваў **жыхар блакаднага Ленінграда Анатоль ВАЛАСЕВІЧ.** — А ці ўсведамляюць, што гэта сапраўды самае каштоўнае? Фраза, якую мы заўсёды паўтаралі — каб не было вайны, — цяпер вельмі актуальная».

**Вераніка КАНЮТА.**

## Меркаванні

**Анатоль МАРКЕВІЧ:**

### «МЫ МОЦНЫЯ НАШАЙ ПАМЯЦЦЮ»

Па словах міністра культуры Анатоля Маркевіча, значнасць і ўрачыстасць Дня Перамогі нават праз шмат гадоў не змяншаецца, а наадварот, з кожным годам толькі ўзрастае: «Перамога дасталася вялікай цаной, і мы разумеем, што дзякуючы савецкаму салдату наша краіна сёння жыве мірна і спакойна. Здавалася б, ва ўсім свеце павінны шанаваць гэты спакой і дабрабыт. Але, на вялікі жаль, так не адбываецца, таму што ў некаторых краін праяўляюцца вялікія нядобрыя амбіцыі, і яны навязваюць свае ідэі і нашаму грамадству ў тым ліку. Але мы моцныя духам, мы моцныя нашай памяццю, гістарычным мінулым, і мы цудоўна разумеем, як цяжка нам дасталіся мір і спакой. Гэта сёння самае важнае. Мір і спакой накіроўваюць да стварэння, даюць магчымасць спакойна гадаваць дзяцей і глядзець упэўнена ў будучыню. І гэта мы шануем і нікому не дазволім у нас гэта забраць. Ні ў якім разе».

**Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ:**

### «9 МАЯ — СВОЕАСАБЛІВЫ МАСТОК ПАМІЖ ПАКАЛЕННЯМІ»

Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр Вальфовіч расказаў, што для яго асабіста азначае Дзень Перамогі і якія задачы перад ваеннымі ставіць гэтае свята: «Абараняць сваю краіну, сваю сям'ю заўсёды было прэрагатывай і справай гонару кожнага мужчыны. Такое свята, як 9 Мая, святое для кожнага беларуса, для кожнага разважнага чалавека асабліва актуальнае і важнае. Для беларусаў Дзень Перамогі — неад'емная частка нашай нацыянальнай самасвядомасці, нашай гістарычнай памяці, якая аб'ядноўвае народ. Гэтае свята — своеасаблівы масток, які аб'ядноўвае мінулае і цяперашняе пакаленні. І мы прымаем усе меры, каб цяперашняму пакаленню ніколі не прыйшлося сутыкнуцца з тымі пагрозамі і выпрабаваннямі, якія выпалі на долю папярэднікаў. Я ведаю, наколькі гэта важна, на прыкладзе сваёй сям'і. У мяне ваенная дынастыя, мой бацька — кадравы афіцэр, мой сын — кадравы афіцэр. І абодва маіх дзяды ваявалі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Мой дзед Аляксандр Рыгоравіч Вальфовіч прайшоў усю вайну з 1941 да 1945 года на пасадзе зампаліта пяхотнай роты, практычна на перадавой, атрымаў сур'ёзнае раненне, узнагароджаны баявымі ордэнамі. Мяне назвалі ў яго гонар, і так здарылася, што я пайшоў па шляху сваіх дзядоў. У кожнага пакалення свае складанасці, свой час. Сёння час выбраў нас, і сёння мы павінны прымаць рашэнні, якія будуць садзейнічаць недапушчэнню тых трагічных падзей, ад якіх 80 гадоў таму пакутавалі нашы папярэднікі. Мы, як дзеці і ўнукі пераможцаў, шануем мір і спакой і робім усё магчымае, каб іх захаваць».

**Аляксандр КОСІНЕЦ:**

### «АХВЯРАВАЎШЫ СВАІМ ЖЫЦЦЁМ, У ІМЯ МІРУ І СВАБОДЫ, ЯНЫ АБАРАНІЛІ НАША МІРНАЕ НЕБА»

Намеснік старшыні Усебеларускага народнага сходу Аляксандр Косінец адзначыў, што памяць аб подзвігу беларусаў у гады Вялікай Айчыннай вайны будзе жыць заўсёды: «Праз гады, праз стагоддзі беларусы будуць памятаць Перамогу сваіх бацькоў, дзядоў, прадзедаў, якія вызвалілі ад карычневай чумы ўсё чалавецтва. Велізарнай цаной далася гэтая перамога — загінуў кожны трэці беларус. Ахвяраваўшы сваім жыццём, у імя міру і свабоды, яны абаранілі наша мірнае неба. Дзякуючы ім мы жывём у моцнай, светлай, квітнеючай Беларусі. Нізкі ім паклон. Мая маці з партызанскай сям'і, яны ваявалі ў атрадзе Канстанціна Заслонава. Мой дзядзька па лініі бацькі Сяргей Мікалаевіч Косінец прайшоў ад Сталінграда да Берліна, камандаваў танкавым батальёнам, меў сем баявых ордэнаў. Нашы продкі перажылі вялікае гора. І сёння для нас 9 Мая — вялікае свята, але свята са слязамі на вачах».

**Валерыя СЦЯЦКО.**